от региональных условий. Однако прогнозы, связанные с качеством образования, практикой преподавания в связи с его медиализацией, далеко неоднозначны. Так, с развёртыванием различных видов аудиовизуальных средств растёт опосредованность взаимодействия участников образования. Также при виртуализации образования деятельность преподавателя теряет своё авторство и контекстность. Исследователи отмечают, что «при виртуализации пространственно-временные отношения педагогической реальности теряют свою сложность и уникальность, всё дальше уводя от личностно-ориентированного аспекта образования» [12, с. 117].

Виртуальный уровень образования порождает новые формы человеческой активности и в этой связи должен рассматриваться как самостоятельный вид деятельности, связанный с программированием виртуальных дидактических систем, требующих собственных методик и технологий (дидактические компьютерные игры, тесты, виртуальные лекции) [13]. Также необходимо отметить, что развитие медиатехнологий подготовило образование к кардинальным переменам, и их сущность лежит значительно глубже, чем только переход к новым методам использования учебных материалов и форм коммуникации в процессах дистанционного обучения.

**Заключение.** Анализ процесса медиализации в различных областях социальной жизни позволяет сделать выводы, что медиализация ведёт к симулякризации информационного поля культуры, становясь глобальным феноменом. Медиатехнологии на современном этапе инкорпорированы в социальную ткань. Использование медиатехнологий активно преобразует практики информационного обмена, формирует новые модели комумникации — электронный рынок, информационную экономику и т. д. Вместе с тем тенденция медиализации имеет дуальную природу: возможность максимально быстро и удобно совершать коммуникацию на уровне социальных институтов, создавать новые направления искусства, приобщиться к созданию виртуальных достижений. С другой стороны, последствия медиализации могут выражаться в трансформации принципов организации социальной жизни, что может сказываться на национальных социокультурных традициях, постепенном изменении персональной идентичности индивида, изменении трансляции культурного опыта и т. д. Это вызывает острую необходимость рефлексии медиализации как феномена информационного общества.

**Список цитируемых источников**


1. Словари на Академике [Электронный ресурс] // АКАДЕМИК, 2000—2014. URL: http://noum_ru.academic.ru (дата обращения 02.04.2016).
2. Губанков А. Н. Сетевые СМИ в культурном пространстве города: коммуникация, интерпретация, диалог : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01. СПб., 2011. 16 с.
3. Волков А. А. Филология и риторика массовой информации [Электронный ресурс]. URL: http://evartist.narod.ru/text12/05.htm#з_01 (дата обращения 17.03.2016).
4. Интерес к современной науке [Электронный ресурс]. URL : http://fom.ru/Nauka-i-obrazovanie/11721 (дата обращения 17.03.2016)
5. Литвинович В. М. Медиасфера Беларуси: социологический аспект. Минск : ИАЦ, 2014. 98 с.
6. Осипова Г. В. Беларусь и Россия: социальная сфера и социокультурная динамика. Минск : ИАЦ, 2012. 318 с.
7. Рынок электронной торговли Беларуси [Электронный ресурс]. URL: http://www.belassist.by/upload/files/e-commerce-test.pdf (дата обращения 05.04.2016).
8. Вайнштейн Г. И. Информационная революция и демократия: ожидания, реальность, перспективы // Мировая экономика и международные отношения. 2003. № 7. С. 13—21.
9. Там же. С. 18.
10. Охрименко З. А. Развитие электронного правительства в Республики Беларусь // Беларуская думка. 2013. № 5. С. 50—52
11. Каган М. С. Философская теория ценности. СПб. : Петрополис, 2006. 205 с.
12. Лаврикова Т. В. Педагогика личности. Педагогическая практика личностной ориентации. Воронеж : ВГПУ, 2008. 131 с.
13. Там же.


УДК 94

**М. А. Гулюк**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Мінск*

# ПЕРШАЯ РАСІЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ 1905—1907 ГГ. І МАДЭРНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫХ УСТАНОЎ ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУГІ

**Уводзіны.** Першая расійская рэвалюцыя 1905—1907 гг. стала знакавай падзеяй у гісторыі Расіі, паколькі яна паклала пачатак трансфармацыі самадзяржаўя ў канстытуцыйную манархію еўрапейскага тыпу і закранула ўсе бакі ўнутранай палітыкі царызму. У сувязі з гэтым прадстаўляе цікавасць, якім чынам новы ўрадавы курс рэалізоўваўся ў нацыянальных рэгіёнах, уплыў, аказаны рэвалюцыйнымі падзеямі на такія аспекты адукацыйнай палітыкі царызму ў беларуска-літоўскіх губернях, як мадэрнізацыя вучэбна-педагагічных устаноў і падрыхтоўка да ўвядзення ўсеагульнага пачатковага навучання.

**Асноўная частка.** Напярэдадні Першай расійскай рэвалюцыі падрыхтоўкай настаўнікаў пачатковай адукацыі для Віленскай навучальнай акругі (далей — ВНА), у склад якой уваходзілі беларуска-літоўскія губерні, займаліся тры

© Гулюк М. А., 2016

Репозиторий БарГУ

ведамствы — Міністэрства народнай адукацыі (далей — МНА), Свяшчэнны Сінод і часткова Ведамства устаноў імператрыцы Марыі. Галоўная роля сярод іх належала МНА, якому падпарадкоўваліся пяць настаўніцкіх семінарый і два настаўніцкіх інстытуты. Штогод яны выпускалі 120—140 настаўнікаў народных, гарадскіх і казённых яўрэйскіх вучылішч. Царкоўнае ведамства адкрыла ў ВНА 2 царкоўна-настаўніцкія і 30 другакласных настаўніцкіх школ, 1 епархіяльнае і 5 жаночых духоўных вучылішч. Па якасці прафесійнай падрыхтоўкі яны значна саступалі настаўніцкім семінарыям МНА, але па колькасці выпускнікоў перавышалі іх у 2—2,5 раза. Марыінскае ведамства мела ў акрузе пяць жаночых гімназій і адзін шляхецкі інстытут, але іх педагагічныя класы да рэвалюцыі рыхтавалі ў асноўным настаўніц для прыватнага, хатняга навучання.

Сістэма падрыхтоўкі педагагічных кадраў ВНА складвалася пасля паўстання 1863—1864 гг. і несла на сабе моцны адбітак руска-польскага культурнага супрацьстаяння. Асноўныя прынцыпы гэтай сістэмы, закладзеныя яшчэ М. Н. Мураўёвым, засталіся амаль некранутымі і ў пачатку XX ст. Галоўным з іх быў прынцып канфесійнай і моўнай выключнасці. У педагагічныя ўстановы ВНА прымалі выключна праваслаўных выхаванцаў (выхаванак), і толькі праваслаўныя настаўнікі мелі права працаваць у пачатковых школах акругі [1]. Выключэнне рабілася для іўдзеяў. Яны маглі набыць педагагічную адукацыю ў Віленскім яўрэйскім інстытуце, але працаваць толькі ў казённых яўрэйскіх вучылішчах. Выкладанне ва ўсіх педагагічных установах ВНА вялося на рускай мове.

Згодна з прынцыпам сацыяльнай выбіральнасці пры залічэнні ў навучальна-педагагічныя ўстановы МНА перавага аддавалася выхадцам з сельскіх саслоўяў, а педагагічныя ўстановы духоўнага ведамства прызначаліся для дзяцей духавенства. Нарэшце, трэці прынцып — асаблівая роля праваслаўнай царквы ў развіцці пачатковай адукацыі краю — забяспечваўся даволі шматлікімі царкоўнымі навучальна-педагагічнымі ўстановамі, колькасць якіх пачала хутка павялічвацца з канца XIX ст.

Паслядоўная рэалізацыя гэтых прынцыпаў дазволіла ўраду досыць эфектыўна пашыраць рускі культурны ўплыў сярод праваслаўнага насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў. У той жа час гэтая палітыка ўшчамляла правы іншых нацыянальнасцей і канфесій, складаўшых больш за чвэрць жыхароў дзесяцімільённага краю. Таму патрабаванне спыніць прымусовую русіфікацыю і аднавіць нацыянальную школу стала на пачатку XX ст. адным з галоўных лозунгаў нацыянальна-дэмакратычных рухаў у Беларусі і Літве [2].

Не менш важнае значэнне ў вачах грамадскасці набыло і пытанне мадэрнізацыі працэсу навучання. Сістэма падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў ВНА стваралася ў 1870-х гг. з улікам тагачасных дасягненняў педагагічнай думкі і запатрабаванняў сацыяльна-гаспадарчага жыцця парэформеннай Расіі. У пачатку XX ст. яна значна састарэла і ўжо не адпавядала рэчаіснасці краіны, што ступіла на шлях мадэрнізацыі. Выпускнікі настаўніцкіх семінарый не былі здольны выкладаць ні алгебру, ні хімію, ні нават рускую літаратуру і агульную гісторыю, бо гэтых прадметаў не было ў вучэбных праграмах семінарый. Тыя былі разлічаны толькі на тры гады, а каб стаць выхаванцам семінарыі, дастаткова было вытрымаць іспыт за курс аднакласнага вучылішча МНА.

Не лепш абстаялі справы і ў настаўніцкіх інстытутах. Там добрая трацiна чатырохгадовага тэрміну навучання адводзілася на паўтарэнне семінарскай праграмы, якую большасць выхаванцаў ужо вывучала раней. Бібліятэкі настаўніцкіх інстытутаў, як і семінарый, праходзілі падвойную цэнзуру: МНА і Свяшчэннага Сінода, якая забараняла большасць твораў класікаў рускай літаратуры. Яшчэ горшымі былі справы ў педагагічных установах царкоўнага ведамства.

Жорсткая рэгламентацыя ўсіх бакоў жыцця настаўніцкіх семінарый і інстытутаў, цэнзура, састарэлыя правілы і вучэбныя праграмы неаднаразова выклікалі абурэнне шырокіх колаў педагагічнай грамадскасці. У час Першай расійскай рэвалюцыі гэта вылілася ў шэраг антыўрадавых выступленняў.

Так, у ліпені 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Мінскага павета прайшоў нелегальны з’езд настаўнікаў-беларусаў дэмакратычнай арыентацыі. У ім удзельнічалі каля 30 чалавек, у тым ліку К. М. Міцкевіч (Якуб Колас). Яны запатрабавалі неадкладнага адраджэння нацыянальнай беларускай школы. Гэтую прапанову падтрымалі прадстаўнікі настаўніцкіх семінарый акругі, якія праз месяц нелегальна сабраліся ў Мінску і вырашалі рыхтавацца да агульнай забастоўкі ў семінарыях ВНА. Намаганнямі ўлад тая была сарвана, але ў верасні 1906 г. адбыліся хваляванні ў Маладзечанскай, а вясной 1907-га — у Полацкай настаўніцкай семінарыі. Апошняя была нават часова зачынена, а амаль усе яе выхаванцы звольнены [3].

Рэвалюцыйныя падзеі вымусілі ўрад і вучэбныя ўлады ВНА пачаць пэўную трансфармацыю сваёй адукацыйнай палітыкі. Адной з яе праяў стала мадэрнізацыя вучэбна-педагагічных устаноў, якая ішла па трох напрамках: канфесійным, вучэбна-фінансавым а таксама перагляду ролі жанчыны ў школе.

Дыскрымінацыя нацыянальных і рэлігійных меншасцяў пры падрыхтоўцы кадраў да 1905 г. была адным з самых вострых пытанняў народнай школы ВНА. Аднак менавіта тут урад абмежаваўся мінімальнымі пераўтварэннямі.

У красавіку 1906 г. МНА згадзілася прымаць у настаўніцкія семінарыі акругі старавераў і прызначаць ім казённыя стыпендыі. Дазволена было запрашаць стараверaў і ў лік ганаровых апекуноў навучальных устаноў [4, с. 615]. З чэрвеня 1906 г. у Панявежскую настаўніцкую семінарыю (Ковенская губерня) сталі прымаць літоўцаў і беларусаў каталіцкага веравызнання, а сярод яе выкладчыкаў з’явіўся настаўнік Закона Божага гэтай канфесіі [5].

Улетку 1906 г. МНА паведаміла кіраўніцтву вучэбных акруг, што настаўнікамі народных школ могуць працаваць, разам з праваслаўнымі, таксама і лютаране. На гэтай падставе адміністрацыя ВНА адчыніла лютаранам дзверы Панявежскай семінарыі. Але дазвол МНА не атрымаў заканадаўчага афармлення, таму і дадзеная практыка мела вельмі абмежаваны характар. Не меў істотнага значэння для акругі і дазвол МНА прымаць у настаўніцкія інстытуты краіны на агульных падставах магаметан. У верасні 1907 г. сярод 670 выхаванцаў настаўніцкіх семінарый ВНА налічвалася толькі восем католікаў і адзін лютаранін (усе ў Панявежскай семінарыі), а на педагагічных курсах неправаслаўных слухачоў не было зусім. Не з’явіліся яны і ў Віленскім настаўніцкім інстытуце [6].

Рэпазіторый БарДУ

Значна большы маштаб набыла мадэрнізацыя вучэбнай і фінансавай базы педагагічных устаноў. Тэрмін навучання ў настаўніцкіх семінарыях ВНА з лета 1908 г. быў павялічаны з трох да чатырох гадоў. З'явіліся новыя прадметы: гісторыя рускай літаратуры, усеагульная гісторыя, алгебра, камерцыйная геаграфія; курс фізікі быў павялічаны з дзвюх гадзін у тыдзень да шасці. У 1907 г. былі зменены і састарэлыя правілы пераводных экзаменаў ў семінарыях.

Больш жорсткімі сталі патрабаванні да асоб, жадаючых паступіць у семінарыю. З 1908 г. яны павінны былі вытрымаць іспыт за курс двухкласнага, а не аднакласнага вучылішча МНА. У выніку з 176 чалавек, прынятых у верасні 1908 г. у пяць настаўніцкіх семінарый акругі (Маладзечанскую, Полацкую, Панявежскую, Нясвіжскую і Свіслацкую), толькі трое былі залічаны ў першы клас, а астатнія — у падрыхтоўчы [7, с. 419].

Выпускнікі Віленскага яўрэйскага настаўніцкага інстытута з лютага 1907 г. сталі атрымліваць званне хатніх настаўнікаў без дадатковых экзаменаў. Лагоднейшым стаў унутраны распарадак Віленскага хрысціянскага інстытута, быў ліквідаваны інтэрнат пры ім. У ліпені 1907 г. асоб без двухгадовага педагагічнага стажу наогул забаранілі прымаць у настаўніцкія інстытуты. Такім чынам планавалася павысіць прафесійны ўзровень будучых настаўнікаў гарадскіх вучылішч, а таксама і якасць выкладання ў інстытутах. Аднак правоў сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў яны не атрымалі, а кнігі ў іх бібліятэкі па-ранейшаму траплялі толькі пасля цэнзуры МНА і Сінода [8].

Паступова паляпшалася і фінансавае становішча семінарый і інстытутаў акругі. У 1904 г. па ўзроўні фінансавання Віленскі хрысціянскі настаўніцкі інстытут знаходзіўся на перадапошнім месцы сярод падобных устаноў Расіі. У 1907 г. яго бюджэт павялічыўся да 37 116 р. і дасягнуў сярэднестатыстычнага паказчыка, што дазволіла з таго ж года павялічыць стыпендыі казённым выхаванцам са 150 да 200 р. [9].

Рэвалюцыя паскорыла ўвядзенне ў настаўніцкіх семінарыях ВНА новага Палажэння 1902 г., пераход да якога дагэтуль адбываўся вельмі марудна. Новыя расклады былі уведзены ў акрузе з ліпеня 1908 г., што павялічыла гадавы бюджэт кожнай семінарыі ў паўтары раза (да 20—21 тыс. р.). Гэта дазволіла у 4 разы падняць расходы на гаспадарчыя патрэбы (да 5 250 р. у год на семінарыю), у 3 разы — на лекі для выхаванцаў (да 300 р.), у паўтара раза — на бібліятэку (да 300 р. у год), выдзяліць грошы на навучанне сельскай гаспадарцы (500 р.). Новыя расклады ўводзілі пасаду чацвёртага класнага настаўніка, настаўнікаў працы і малявання. Жалаванне дырэктара і педагогаў-прадметнікаў засталося на ранейшым узроўні (дырэктару — 2 000 р., а штатным педагогам — 1 200 р. у год), але з 1911 г. пачалося паступовае павялічэнне памеру казённых стыпендый (з 95 до 180 р.) [10].

У час рэвалюцыі сталі больш лагоднымі і правілы для педагагічных курсаў. Дазвол на курсы павышэння кваліфікацыі з сакавіка 1906 г. пачало выдаваць кіраўніцтва акругі, а не МНА, а курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў, па Правілах 29 чэрвеня 1907 г., маглі адкрываць не толькі дырэкцыі вучылішч, але таксама грамадскія арганізацыі і прыватныя асобы. Тэрмін навучання на курсах быў павялічаны з аднаго да двух-трох гадоў, а адукацыйны цэнз слухачоў — да ўзроўню двухкласнага вучылішча МНА [11, с. 126].

Першая расійская рэвалюцыя паўплывала і на мадэрнізацыю педагагічных устаноў Свяшчэннага Сінода, ад якіх залежала будучыня ўсёй царкоўнай школы. Шырокамаштабнае царкоўна-школьнае будаўніцтва, разгорнутае ў краіне з другой паловы 1880-х гг. па ініцыятыве обер-пракурора Сінода К. П. Пабеданосцава і асабіста імператара Аляксандра III, нават праз 20 год не мела надзейнага кадравага падмурку. Гэта яскрава назіралася у шэрагу беларускіх епархій (Літоўскай, Мінскай, Полацкай), дзе у 1905 г. 60—70% настаўнікаў пачатковых царкоўных школ працавалі без пасведчання на права выкладання. Мінская ж епархія ўстанавіла сваеасаблівы «рэкорд» — у яе царкоўных школах 84,2% настаўнікаў не мелі адпаведнага пасведчання (у сярэднім па краіне гэты паказчык складаў 44,4%, а па Еўрапейскай Расіі — 32,6%) [12].

У той жа час Магілёўская і Гродзенская епархіі належалі да лідараў агульнарасійскага царкоўна-школьнага будаўніцтва. Перад рэвалюцыяй у іх дзейнічала 15 другакласных і адна царкоўна-настаўніцкая школа (у вёсцы Трасцяніца Бельскага павета Гродзенскай губерні) амаль з 1 500 выхаванцамі [13].

Рэвалюцыя застала царкоўную школу на стадыі рэфармавання, пачатак якому паклалі «Палажэнне аб царкоўных школах ведамства праваслаўнага веравызнання» ад 1 красавіка 1902 г. і новая праграма для царкоўных настаўніцкіх школ 1903 г. Першы з гэтых дакументаў нарэшце вызначыў тыпы педагагічных устаноў ведамства Свяшчэннага Сінода (другакласная школа, мужчынская і жаночая царкоўна-настаўніцкая школы), а другі — падняў іх вучэбную праграму да ўзроўню настаўніцкіх семінарый МНА (якая, дарэчы, ужо састарэла). Спынены рэвалюцыйнымі падзеямі, працэс рэарганізацыі царкоўнай школы ўзнавіўся летам 1907 г. Пры гэтым трэба ўлічваць, што выхаванцы царкоўна-педагагічных устаноў у час рэвалюцыі выказалі абсалютную лаяльнасць уладзе, а на царкоўна-школьных з'ездах, якія адбыліся ў большасці беларуска-літоўскіх епархій у 1905—1907 гг., гучалі два галоўных матывы: заклікі да «закручвання гаек» і да фінансавай дапамогі з боку ўрада [14].

Для абмеркавання шляхоў мадэрнізацыі царкоўнай школы Расіі ў 1907—1908 гг. у Санкт-Пецярбурзе адбыўся шэраг асобых нарад, скліканых Вучылішчным саветам Св. Сінода.

Так, нарада 23—28 ліпеня 1907 г. была прысвечана вучэбна-выхаваўчаму і гаспадарчаму забеспячэнню царкоўна-настаўніцкіх школ. На той момант з 20 падобных школ Расіі 6 знаходзіліся ў беларуска-літоўскіх (у тым ліку Смаленскай) і ўкраінскіх губернях. На нараду, якую ўзначаліў старшыня Вучылішчнага савета протаіерэй П. І. Сакалоў, былі запрошаны і беларускія прадстаўнікі, у прыватнасці, загадчык Барунскай мужчынскай школы Літоўскай епархіі святар М. А. Долатаў.

Нарада выпрацавала праекты «Палажэння аб Савеце царкоўна-настаўніцкай школы» і «Правілаў аб навучэнцах». Першы праект пашырыў кола асоб, якія мелі права ўдзельнічаць у працы педсавета і ўплываць на яго рашэнні, а другі — узроставыя рамкі для выхаванцаў, а таксама прадугледжваў стварэнне жаночых царкоўна-настаўніцкіх школ. Акрамя таго, нарада вырашыла, што адной з прыярытэтных дысцыплін у царкоўна-настаўніцкіх школах павінна стаць тэорыя і практыка вядзення сельскай гаспадаркі. Кожнай са школ раілася набыць зямельны надзел у 5—6 дзесяцін, каб будучыя настаўнікі маглі знаёміцца з рацыянальнымі метадамі гаспадарання [15].



Рэпазіторый БарДУ

З 29 лістапада 1907 г. па 15 лютага 1908 г. у Пецярбургу прайшла яшчэ адна царкоўна-школьная нарада, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі Літоўскай (святар М. М. Пашкевіч, дырэктар Беразвечскай другакласнай школы А. С. Вераксін) і Магілёўскай (загадчык Альшанскай другакласнай школы А. А. Рубцоў) епархій. Цэнтральным пытаннем гэтай нарады стала будучыня другагакласных школ [16].

На думку ўдзельнікаў нарады, нягледзячы на праекты МНА па стварэнню агульнарасійскай свецкай школы, царкоўныя школы, асабліва ў «Заходнім краі», будуць існаваць яшчэ доўгі час. Менавіта тут яны карыстаюцца ўсенароднай падтрымкай і выконваюць не толькі адукацыйную, але і важную палітычную задачу. Таму трэба тэрмінова забяспечыць іх кадрамі, а дзеля гэтага выкарыстаць ужо назапашаны вопыт, у тым ліку Магілёўскай і Гродзенскай епархій.

Нарада прапанавала ператварыць існуючыя другакласныя настаўніцкія школы ў царкоўна-настаўніцкія і значна пашырыць іх праграму, павялічыць з двух да трох гадоў тэрмін навучання, а ўзрост паступаючых зменшыць з 13—17 да 12—15 гадоў. Для умацавання сувязі настаўнікаў з вёскай і дадатковага заробку выхаванцаў павінны былі вучыць, апрача агульных дысцыплін, сталярнай і кавальскай справе, садаўніцтву і агародніцтву. Гадавы бюджэт новай школы складаў 6 120 р. (раней 3 000 р.), а жалаванне выкладчыкам — 540 р. (раней 480 р.).

Ужо існуючыя царкоўна-настаўніцкія школы нарада раіла зрабіць семінарыямі, а лепшыя з іх — нават царкоўнымі інстытутамі. У кожнай епархіі прапаноўвалася адкрыць адну-дзве царкоўна-настаўніцкія семінарыі, дзе рыхтавалі б кадры для новых другакласных школ. Адпаведна падымаўся адукацыйны цэнз залічаных ў царкоўна-настаўніцкія семінарыі і тэрмін навучання (да трох-чатырох гадоў).

Обер-пракурор Сінода П. П. Ізвольскі пагадзіўся з большасцю гэтых прапаноў, і 3 верасня 1908 г. яны былі прыняты як новыя «Правілы аб другакласных школах» [17]. Яшчэ раней, 27 верасня — 11 кастрычніка 1907 г., Сінодам былі зацверджаны новыя «Правілы» аб царкоўна-настаўніцкіх школах [18, с. 328]. Такім чынам, прынцыпы, распрацаваныя святаром Флорам Сасноўскім для Трасцяніцкай школы, знайшлі агульнарасійскае прымяненне, нягледзячы на тое, што сама яна згарэла ад наймацнейшага пажару ў канцы 1906 г.

Згодна з новымі правіламі ў 1910-х гг. царкоўныя настаўніцкія школы беларуска-літоўскіх епархій былі рэарганізаваны. У пачатку 1913—1914 г. толькі ў 22 мужчынскіх школах краю навучалася 1 214 чалавек. За папярэдні год гэтыя школы падрыхтавалі 229 настаўнікаў [19, с. 214—215].

Трэцім напрамкам трансфармацыі кадравай палітыкі ў галіне пачатковай адукацыі стаў перагляд ролі жанчыны ў школе. У параўнанні з іншымі навучальнымі акругамі ВНА сур'ёзна адставала па выкарыстанні жаночай педагагічнай працы: на 1 студзеня 1905 г. у яе народнай школе жанчыны складалі толькі 30,4% педагогаў, у той час як у Еўрапейскай Расіі — 51,2% [20].

Да рэвалюцыі ў Расіі не было не толькі грамадскіх ці прыватных, але нават казённых жаночых настаўніцкіх семінарый, нягледзячы на тое, што іх неабходнасць прызнавала як грамадскасць, так і МНА. Настаўніцы вялі больш маральны лад жыцця, здавольваліся меншым заробкам і, у адрозненне ад мужчын, не кідалі школу пры першай трапнай магчымасці. Улічваючы планы па ўвядзенні ўсеагульнай адукацыі і хранічны недахоп педагагічных кадраў, прыцягненне жанчын у пачатковую школу набывала асаблівае значэнне.

У верасні 1906 г. МНА перадало ў Кабінет Міністраў праект статута жаночых настаўніцкіх семінарый. У сувязі з тым, што разгляд праекта зацягваўся, летам 1908 г. міністэрства атрымала дазвол адкрываць жаночыя семінарыі па Палажэнні 1902 г. для мужчынскіх семінарый. Але да 1911 г. у жаночых семінарыях выкладчыкі атрымлівалі на 20% менш, чым у мужчынскіх, нягледзячы на тое, што іх службовыя правы былі аднолькавымі [21].

Папячыцель акругі В. А. Папоў яшчэ да рэвалюцыі хадайнічаў перад МНА аб адкрыцці жаночых семінарый у гарадах Барысаве (Мінская губернія) і Рагачове (Магілёўская губерня). Гэтыя планы падтрымлівала і грамадскасць. Так, гарадская дума Барысава ў 1904 г. пастанавіла выдзяліць на будаўніцтва новай установы 3 000 р. і падарыць ёй тры дзесяціны зямлі, а затым штогод даваць па 1 000 р. Утрыманне Барысаўскай жаночай семінарыі павінна было абысціся у 20 000 р. штогод, з якіх палову абавязалася выплачваць мясцовае земства [22].

Першую жаночую семінарыю МНА вырашыла адчыніць у Барысаве, а другую — у Оршы Магілеўскай губерні. Гэта павінна было адбыцца ў 1909—1910 гг. Акрамя таго, вялася перапіска з ваенным ведамствам аб перадачы акрузе пакінутых ваенных казармаў з прылеглай тэрыторыяй ў мястэчках Дзярэчын (Слонімскі павет Гродзенскай губерні) і Орня (Ковенская губерня). Там таксама планавалася адкрыццё жаночых настаўніцкіх семінарый [23].

Велізарныя фінансавыя і арганізацыйныя цяжкасці, звязаныя з увядзеннем усеагульнай адукацыі, а таксама расійская бюракратыя запаволілі стварэнне сеткі жаночых настаўніцкіх семінарый у ВНА. І ўсё ж з дапамогаю экстэрната, педагагічных курсаў, жаночых духоўных устаноў да 1914 г. былі дасягнуты значныя поспехі па прыцягненні жанчын у народную школу. На пачатку 1911 г. у ВНА працавалі 4 010 народных настаўніц, што складала 36,7% педагагічнага персаналу пачатковых школ. Пры гэтым агульная колькасць пачатковых школ у акрузе за 1906—1911 гг. павялічылася амаль у 4 разы (з 2 249 да 8 384) [24].

У ліпені 1911 г. у акрузе з'явілася першая жаночая семінарыя — Аршанская, а летам 1914 г. другая — Барысаўская. Семінарыі ў Дзярэчыне і Орне з-за пачатку Першай сусветнай вайны і баявых дзеянняў у заходніх губернях адкрыты не былі. Аднак, нягледзячы на ваеннае ліхалецце, у 1915 г. пачала дзейнічаць Гомельская жаночая семінарыя (Магілёўская губерня), а ў 1916 г. — Бабруйская (Мінская губерня).

Яшчэ большую актыўнасць, чым МНА, у пытанні прыцягнення жанчын у пачатковую школу выказала царкоўнае ведамства. Гэта было звязана не толькі з яго абмежаванымі фінансавымі магчымасцямі (адсюль імкненне знайсці танныя педагагічныя кадры), але і з апякунскай роляй, якую ўзяла на сябе праваслаўная царква ў адносінах да дачок сваіх святароў і членаў кліра. Шмат для каго з іх, асабліва для дзяўчат са шматдзетных сем'яў і сірот, настаўніцкая прафесія была адзіным выратаваннем ад галечы.

Рэпазіторый БарДУ

Яшчэ да рэвалюцыі жаночыя духоўныя вучылішча краю, якія давалі сваім выпускніцам права выкладаць у пачатковай школе без дадатковых іспытаў, сталі важнай крыніцай кадраў. Пасля рэвалюцыі гэтая тэндэнцыя ўзмацнілася. Толькі ў царкоўнай школе ВНА ў канцы 1907-га — 1908-м г. працавала каля 500 іх выпускніц. На той момант у Магілёўскім, Полацкім, Віленскім, Мінскім і Парыцкім вучылішчах налічваліся 101 выкладчык і 821 выхаванка, з якіх каля 30% атрымлівалі сінадальныя і епархіяльныя стыпендыі [25]. Да 1914 г. лічба выхаванак у жаночых вучылішчах практычна не змянілася, але штогод яны выпускалі па 150 і болей чалавек, каля трэці з якіх адразу ж ішла настаўнічаць.

Акрамя таго, у Магілёўскай і Гродзенскай епархіях з 1900-х гг. пачалі стварацца жаночыя царкоўныя настаўніцкія школы, некаторыя з якіх з'явіліся ў выніку рэарганізацыі мужчынскіх школ. Пасля рэвалюцыі гэты працэс стаў яшчэ больш інтэнсіўным.

У Магілёўскай епархіі шырокую вядомасць атрымала Буйніцкая другакласная жаночая школа пад Магілёвам, якая штогод выпускала па 20—25 настаўніц. Конкурс пры паступленні ў яе дасягаў тры-чатыры чалавекі на месца, а бюджэт у 1906—1907 г. склаў 10 500 р., 70% якіх паступіла з мясцовых крыніц. У 1904 г. у гэтай жа епархіі пачала працаваць Крычаўская жаночая школа (раней яна была мужчынскай). У 1907 г. гэта школа падрыхтавала адразу 32 настаўніцы, што было лепшым паказчыкам сярод падобных устаноў Расіі. Улетку 1912 г. у епархіі налічвалася пяць жаночых настаўніцкіх школ з 387 вучаніцамі [26].

У Гродзенскай епархіі ў 1907 г. працавалі дзве жаночыя другакласныя настаўніцкія школы: Драгічынская і Чырвонастоцкая. Першая у 1907 г. падрыхтавала 25 настаўніц [27, с. 470]; а другая, што дзейнічала пры Бародзіцкам манастыры вёскі Чырвоныя Стокі (Сакольскі павет Гродзенскай губерні), у сакавіку таго ж года была ператворана ў трохкласную царкоўна-настаўніцкую школу. У гонар спадчынніка расійскага прастола школа атрымала назву «Аляксееўскай», а таксама новы трохпавярховы цагляны будынак з электрычнасцю і цэнтральным ацяпленнем. На яго будаўніцтва Сінод выдаткаваў больш за 70 000 р., маючы намер зрабіць гэту школу цэнтрам праваслаўнай педагагічнай адукацыі не толькі Гродзенскай, але і суседніх епархій, у тым ліку Валынскай і Варшаўскай. У 1911—1912 г. у Чырвонастоцкай школе займалася 56 чалавек, і яна падрыхтавала 21 настаўніцу [28].

Усяго да лета 1912 г. у беларуска-літоўскіх епархіях дзейнічала адна жаночая царкоўна-настаўніцкая і 10 другакласных жаночых школ з трохгадовым тэрмінам навучання (902 выхаванкі). Толькі за 1911—1912 г. яны падрыхтавалі 178 настаўніц пачатковых класаў [29].

Да 1910-х гг. урад вызначыўся і ў дачыненні да педагагічных класаў жаночых гімназій МНА і Марыінскага ведамства. Да пачатку ХХ ст. лічылася, што гэтыя класы павінны рыхтаваць хатніх настаўніц, а таксама прывіваць падагагічныя навыкі сваім выхаванкам як будучым маці. У сувязі з планамі па ўвядзенні ўсеагульнай адукацыі у Расіі галоўнай і адзінай задачай педагагічных (восьмых) класаў жаночых гімназій стала падрыхтоўка настаўніц пачатковай школы. У 1907 г. такія ж класы былі створаны у жаночых духоўных і епархіяльных вучылішчах [30].

**Заключэнне.** Першая расійская рэвалюцыя 1905—1907 гг., толькі нязначна змяніўшы канфесійны падыход да падрыхтоўкі кадраў у ВНА, у вялікай ступені паспрыяла мадэрнізацыі вучэбна-педагагічных устаноў акругі і прывяла да перагляду ролі жанчыны ў пачатковай школе.

Репозиторий БарГУ

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Инструкция училищным советам дирекций народных училищ Виленского учебного округа // Сб. распоряжений по М-ву народ. просвещения : в ? т. СПб., 1905. Т. 7. С. 784—795.
2. Вестник Воспитания. 1906. № 2. С. 129, 161 ; Русская мысль. 1909, Кн. 12. С. 70—71 ; Kubicki Paweł. Bojownicy Kapłani za sprawę Kościoła Ojczyzny w latach 1861—1915 : w 2 cz. Sandomerz, 1936. Cz. 2, T.1. S. 288, 744—745.
3. Вестник Воспитания. 1909. № 2. С. 169, 174 ; Казлоўскі Міхась. Галасы разбуджаных птушак. Мінск, 2006. 23 с. ; Народное образование в Виленском учебном округе. 1907. № 3. С. 122.
4. Народное образование в Виленском учебном округе. 1913. № 11.
5. Народное образование в Виленском учебном округе. 1906. № 4. С. 3 ; Циркуляр по Виленскому учебному округу. 1906, № 10—11. С. 522.
6. Всеподданнейший отчёт министра народного просвещения за 1906 год. СПб., 1908. С. 49, 156 ; Отчёт по управлению Виленским учебным округом за 1907 гражданский год. Вильна, 1908. С. 56.
7. Народное образование в Виленском учебном округе. 1908. № 10.
8. Виленский календарь на високосный 1912 год. Вильно, 1912. С. 64 ; Народное образование в Виленском учебном округе. 1907. С. 120 ; Циркуляр по Виленскому учебному округу. 1906. № 3. С. 88.
9. Всеподданнейший отчёт министра народного просвещения за 1902 год. СПб., 1904. С. 444. ; Всеподданнейший отчёт министра народного просвещения за 1906 год. С. 154—155.
10. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собр. 3 : в 30 т. СПб., 1904. Т. 22, № 21119 ; Т. 28, № 30480 ; Народное образование в Виленском учебном округе. 1907. № 4. С. 178.
11. Виленский календарь на високосный 1912 год. С. 126.
12. Ежегодник России: 1905 (год второй). СПб., 1906 С. 513 ; Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884—1909 гг.) / под общ. ред. П. И. Соколова. СПб., 1909. С. 16—17.
13. Гродненские епархиальные ведомости. 1902. № 11. 102 с. ; 1903. № 32. 7 с. ; Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1905—1907 годы. СПб., 1910. 304 с.
14. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1905—1907 годы. С. 240 ; Могилёвские епархиальные ведомости. 1909. № 15. С. 559 ; Литовские епархиальные ведомости. 1905. № 22 —23, С. 202—205 ; Полоцкие епархиальные ведомости. 1905. № 5—7. С. 327—329.
15. Церковные Ведомости. 1907. № 31. С. 1 239—1 282.
16. Церковные Ведомости. 1908. № 6. С. 287—289 ; № 7. С. 335—337 ; № 8. С. 380—388.
17. Церковные Ведомости. 1908. № 39. С. 299—304.
18. Исторический очерк развития церковных школ за истекшее двадцатипятилетие (1884—1909 гг.). С. 328.
19. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1911—1912 годы. 336 с.

20. Ежегодник России. 1905. (Год второй).
21. Русская школа. 1904. № 10—11. С. 123 ; Журнал Министерства народного просвещения. 1911. Сентябрь. Раздел неофиц. С. 9.
22. Русская школа. С. 141.
23. Народное образование в Виленском учебном округе. 1909. № 12. С. 486—487 ; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Ф. 1422. Волковысское городское училище. Оп. 2. Д. 46.
24. Виленский календарь на високосный 1912 год. С. 73, 125.
25. Там же. С. 126. ; Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1905—1907 годы. С. 205.
26. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1911—1912 годы. С. 214—215 ; Церковные Ведомости. 1909. № 10. С. 470.
27. Церковные Ведомости. С. 470.
28. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1911—1912 годы. С. 214—215 ; ПСЗРИ. Собр. 3. Т. 27. № 29238.
29. Всеподданнейший отчёт обер-прокурора Святейшего Синода по ведомству православного исповедания за 1911—1912 годы. С. 214—215.
30. Вестник воспитания. 1913. № 4. С. 34 ; ПСЗРИ. Собр. 3. Т. 27. № 29618.

УДК 27(043.3)+008(043.3)

**Д. В. Доронин,**
**Ю. И. Рубан**
*Санкт-Петербургский государственный университет, Санкт-Петербург, Российская Федерация*

## БЕЛОРУССКИЕ ТРЕБНИКИ ПЕРИОДА УНИИ В АСПЕКТЕ ЛИТУРГИЧЕСКОГО БОГОСЛОВИЯ

**Введение.** Когда мы говорим о сохранении национальной идентичности белорусского общества в настоящее время, то с неизбежностью обращаемся к опыту прошлого, памятуя слова немецкого историка Рудольфа Зома: «Современность непонятна сама из себя…». При этом источниками нашего рассмотрения могут быть различные памятники прошлого, в первую очередь, разумеется, письменные, содержащие непосредственную информацию по интересующей нас теме. Это бесспорно. Но столь же бесспорно и то, что при их отборе не избежать субъективизма, связанного с религиозными или политическими пристрастиями исследователя. Один считает, что мнение общества определённого периода отражает такой-то политический документ (королевский декрет, согласительный документ сейма), другой же — что он выражает лишь диктат власти, а подлинная воля народа отражена совсем в иных текстах — публичных протестных заявлениях, частной переписке и прочих. К единому мнению мы вряд ли придём.

В то же время существует группа источников, именуемых литургическими (или богослужебными) книгами, которые объективно отражают богословие и молитвенную практику всего общества и опираются на вековые традиции, усвоенные и одобренные верующим народом. Субъективное вторжение в их тексты, связанное с политико-религиозными преобразованиями идущими «сверху», сразу же выплывает на поверхность и служит хорошим материалом для объективного исследователя. Для анализа авторами отобраны книги, принадлежащие к жанру требников. Мы кратко проанализируем наиболее влиятельные требники периода унии, пытавшейся ввести жизнь православных белорусов в западное русло. Отметим наиболее характерные изменения в их молитвословиях, напрямую связанные с внешним влиянием или даже диктатом.

Предлагаемая информация носит характер вводных тезисов в обширную тему трансформации белорусской богослужебной жизни. Равным образом, и выводы, основанные на ограниченной группе материала, могут оцениваться как предварительные.

**Основная часть.** *Требник как тип литургической книги (общее понятие).* История формирования славянского требника показывает, что, как тип литургической книги, он генетически восходит к византийскому богослужебному сборнику под названием «Евхологион» (Euchologion), буквально — «Молитвослов», «Молитвенник». (Не путать с современной книгой личного благочестия такого же названия, предназначенной для мирян.) Этот формальный термин долго (до XIX в.) употреблялся в украинской и белорусской литургической традиции. На Руси были в ходу более точные в смысловом отношении названия «Потребник» (до середины XVII в.) и «Требник», указывающие, что эта литургическая книга содержит молитвы и службы, совершаемые «по требованию» и в любое время (в отличие, например, от Часослова).

Евхологий распался у славян на три самостоятельные книги: служебник, требник (большой, малый и дополнительный) и чиновник (понтификал). Процесс формирования книг был долгим, окончательную форму они приняли в изданиях XVI—XVII вв. Древнейший славянский печатный требник — «Цетинье» (Черногория), 1495—1496 гг., к сожалению, сохранился с большими утратами. Первый полностью сохранившийся сербский требник датируется 1538—1540 гг., первый украинский требник — 1606 г. (Стрятин), русский требник («Потребник») — 1623 г. (Москва).

*Первая редакция белорусского требника 1617—1618 гг. (Вильно, братская типография, 1617 г.).* Время и обстоятельства издания литургических книг определяются, в первую очередь, внутренними факторами развития церковной жизни. Но существуют и внешние условия, напрямую влияющие на этот процесс. В 1617 г. в виленской типографии Леона Мамонича вышли одновременно два служебника — униатский Льва Сапеги и альтернативный ему

© Доронин Д. В., Рубан Ю. И., 2016

Репозиторий БарГУ